УДК 283 [289 (476) 281.93] (091)

*А.А.ГАРБАЦКІ*

# ГІСТОРЫЯ СТАРААБРАДНІЦТВА МАГІЛЁЎШЧЫНЫ ў канцы XVII – першай палове XIX стст.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Раскол Рускай праваслаўнай царквы, які адбыўся ў сярэдзіне XVII ст., з'явіўся адным з самых складаных падзей у гісторыі Расіі, ён зрабіў пэўны ўплыў на далейшае развіццё дзяржавы. Раскол выліўся ў складаную сацыяльна-эканамічную з'яву, а па сваіх далёка ідучых выніках, бадай што, не мае прэцэдэнтаў у рускай гісторыі.

Знешняя палітыка Расіі, а таксама пачатак рэфармавання царквы ў першай палавіне XVII ст. прывялі да стварэння ў Маскве гуртка "ревнителей благочестия", у яго ўвайшлі Нікан, які быў тады архімандрытам, пратапапы Іван Няронаў, Авакум, Данііл, Логін, Лазар і іншыя. У гурток уваходзілі таксама прадстаўнікі свецкай прыдворнай знаці, а ўзначаліў яго духоўнік С. Ваніфацьеў. Галоўнай мэтай гуртка было аднаўленне праваслаўя ў яго чысціні шляхам выпраўлення богаслужэбных кніг і ліквідацыі непарадкаў у царкоўным жыцці абапіраецца на рашэнні Стоглавага сабора.

Выпраўленне царкоўных кніг і царкоўных абрадаў, сацыяльна-эканамічныя ўмовы таго часу, праведзеныя Ніканам рэформы прывялі да канчатковага расколу Рускай праваслаўнай царквы, а жорсткая барацьба былых прыхільнікаў Нікана супраць яго рэформ тлумачылася тым, што Нікан абмяжоўваўся толькі фармальным выпраўленнем кніг і абрадаў, у той час як, на думку "ревнителей благочестия" (Авакума, Няронава, Лазара і інш.), у выпраўленні мелі патрэбу ў першую чаргу не кнігі і абрады, а сам царкоўны побыт, правы духавенства, а галоўнае – гэта сам побыт рускага чалавека.

Будучы першапачаткова з'явай толькі царкоўнага жыцця, раскол у далейшым закрануў усе бакі грамадскага жыцця: стаў прычынай міграцыі людзей, "запаліў" вогнішчы самаспальвання, нарадзіў турмы і катаванні. У выніку антынародных дзеянняў улад і царквы рускі чалавек у другой палавіне XVII ст. у сваім родным доме аказаўся ізгоем. Народу былі незразумелымі крокі цара і патрыярха, калі яны аб'явілі ератычным усё тое, што выхоўвалася стагоддзямі, змяшчалася ў кнігах, па якіх засвойвалі першапачатковую грамату дзеці. Гісторыя рыхтавала рускаму народу цяжкія выпрабаванні не на адно стагоддзе, а адзіны ў сваёй веры народ раздзяліўся на абаронцаў даўніны (папоўцаў і беспапоўцаў) і прыхільнікаў ніканаўскай царквы.

Цара і ўрад, больш за ўсё, непакоіў Авакум, колішні аднадумец Нікана, а цяпер галоўны тэарэтык прыхільнікаў старога абраду, а таксама маскоўская група яго паслядоўнікаў. 26 жніўня 1667 года Авакум з трыма аднадумцамі быў

прыгавораны да ссылкі ў Пустазерск, дзе і быў пакараны смерцю. Пазней былі арыштаваныя і пакараныя смерцю яшчэ некалькі абаронцаў даўніны [1].

Пасля арганізаваных ганенняў абаронцы старога абраду і паслядоўнікі Авакума з'явіліся ва ўсіх кутках рускай зямлі. У Чарнігаўскай губерні цэнтрам папоўства стала Старадуб'е. Ідэі расколу сюды прынёс маскоўскі святар Казьма, які не падпарадкаваўся рашэнням сабора 1666 – 1667 гадоў і ўцёк з Масквы да свайго сябра, старадубскага палкоўніка Гаўрылы Іванова. З Казьмою ўцяклі яшчэ дваццаць яго аднадумцаў. Іваноў загадаў атаману Ламаку адвесці Казьму і яго аднадумцаў у мястэчка Пануроўку. У 1669 годзе каля ракі Рэўна яны пачалі будаваць скіты. Пагалоска пра Старадуб'е распаўсюджвалася хутка, і неўзабаве тут сабралася вялікая колькасць паслядоўнікаў "расколу". У старадубскіх лясах яны заснавалі чатыры слабады: Сіні Калодзеж, Белы Калодзеж, Замешава і Шалома. Сюды з Бялёва са сваім сынам Дзмітрыем прыйшоў Стэфан, які заснаваў яшчэ адну слабаду – Міцькоўку. Стэфан і Казьма адпраўлялі ўсе службы, акрамя літургіі, таму што не было храма. Праз пэўны час лік слабод вырас у некалькі разоў: Клімаўскі пасад, Зыбкаўская, Клінцоўская, Лужкоўская, Злынская, Міцькоўская, Шаломаўская, Яленская, Дабранская, Воранаўскі пасад, Дзямееўка, Чуровічы, Цімошкін перавоз, Свяцкая, Ардон, Млінка, Радуль [2].

Пра падзеі ў Старадуб'і было вядома мясцовай духоўнай і свецкай уладзе, аднак яны пакуль не звярталі ўвагі на стараабраднікаў. Першай звярнула ўвагу на іх царэўна Соф'я. Для прыняцця рашэння па "усмирению" "расколу" яна даслала на імя чарнігаўскага архірэя і старадубскага палкоўніка Сімяона ўказ, каб уцекачоў з старадубскіх слабод вярнулі на іх радзіму і перавялі ў праваслаўе [3]. Стараабраднікі пэўны час хаваліся, а потым адна іх частка вярнулася ў Старадуб'е, а другая разам са сваімі святарамі дзеля большай бяспекі перабралася на беларускія землі ў Рэч Паспалітую, на Ветку [4]. Сюды перабраліся Казьма са Стэфанам і іх блізкія сябры. Пасля прыходу на беларускія землі яны пасяліліся на востраве Ветка, які займаў у акружнасці не больш дзвюх вёрст. Тут таксама была і рака Ветка, а землі гэтыя належалі пану Халецкаму.

Пан Халецкі быў вельмі рады прышлым. Справа ў тым, што абаронцы даўніны, якія да яго прыходзілі, сяліліся на пустуючых землях, дбайна і рупліва сталі іх абрабляць. Акрамя таго, Халецкі атрымліваў ад іх добры аброк, што таксама яго задавальняла. Ён жа абяцаў у выпадку неабходнасці абараняць прышэльцаў усімі сіламі. Як адзначалі даследчыкі А.С. Дэмбавецкі і П.І. Мельнікаў, гэта было ў 1685 годзе [5].

Геаграфічнае размяшчэнне Веткі і другіх слабод, палітычнае становішча Рэчы Паспалітай давалі надзею лідэрам стараабрадніцтва і іх прыхільнікам на доўгае пражыванне. Яшчэ больш узмацнілася становішча стараабраднікаў на беларускіх землях, калі зрабіла свае высновы спецыяльная ўрадавая камісія (сакратар А.М. Полцей), якая была створана ў 1690 годзе "для азнаямлення з новай верай". У выніку расследаванняў у стараабраднікаў не знайшлі ніякага "схизматичества" і прыйшлі да высновы, што абаронцы даўніны не належаць да ліку небяспечных для дзяржавы і царквы сектантаў [6].

Вестка аб падзеях на Ветцы разнеслася па ўсіх месцах. Сюды прыбывалі ўсё новыя і новыя людзі. Ветка становіцца главой папоўшчыны. Людзей прываблівалі расказы аб бяспечнасці прыстанішча і розных выгодах жыцця, а яшчэ болей – вестка аб новапабудаванай царкве, якая ў 1695 годзе па благаславенню, дараванаму ад прэасвяшчэннага Паўла, епіскапа Каломенскага, была асвечана ў імя Пакрова Прасвятой Багародзіцы дзевы Марыі на старажытным антымінсе свяшчэннікам Феадосіем [7]. У папоўцаў

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

гэта была адзіная царква. Вакол Веткі насялялася да 14 слабод: Касецкая, Дубовы Лог, Папсуеўка, Мар'іно, Мільча, Чырвоная, Касцюковічы, Буда, Гродня, Ніўкі, Грабоўка, Тарасаўка, Спасаўка [8], у якіх лік жыхароў у другой чвэрці XVIII ст. быў каля 40 тысяч [9]. Сама Ветка была вялікім і прыгожым паселішчам і каля васьмідзесяці гадоў была цэнтрам усяго папоўства.

Усё гэта турбавала ўрад Маскоўскай Русі, які не хацеў мець каля сваіх межаў арганізаваўшыхся і непакорных старaабраднікаў. З мэтаю іх вяртання на ранейшыя месцы жыхарства ўрадам увесь час праводзілася так званая "запрашальная" палітыка, якая не мела вялікага поспеху. Завяршэннем гэтай палітыкі сталі два выгнанні стараабраднікаў з веткаўскіх слабод рускімі войскамі ў 1735 і 1764 гадах, насільна ўварваўшыміся ў землі Рэчы Паспалітай. Пасля праведзеных выгнанняў Ветка перастала быць цэнтрам стараабраднікаў-папоўцаў, а частка іх перасялілася ў другія месцы. Абаронцы старога абраду трапляюць на землі Магілёўшчыны, якія, на той час, былі ў складзе Менскага ваяводства. Перасяліліся сюды з веткаўскіх слабод і беспапоўцы. Частка ж беспапоўцаў перасялілася на Магілёўшчыну з паўночна-заходніх зямель Рэчы Паспалітай (сённяшнія землі Віцебшчыны і Зарасайскага раёна Літвы), дзе выгнаннем займаліся рускія войскі, якія вярталіся з месц ваенных дзеянняў. Рассяліліся стараабраднікі ў непраходных лясах Бабруйскага і Барысаўскага паветаў. Паступова гэтыя месцы сталі для іх пастаянным месцам жыхарства. Былі гэта беспапоўцы федасееўскага і філіпаўскага сагласаў. Другая хваля перасяленняў у Бабруйскі і Барысаўскі паветы была ў 1764 годзе, калі было праведзена другое выгнанне з Веткі. Першапачаткова абаронцы старога абраду жылі на арандаваных землях, а потым сталі набываць зямлю ва ўласнасць [10]. У Бабруйскім павеце з'яўляюцца стараабрадніцкія паселішчы: Капусціна слабада, вёскі Туркі і Салаціно, належачыя беспапоўцам-філіпаўцам. Паміж 1735 і 1765 гадамі тут будуюцца першыя маліто́ўныя дамы [11].

Пасля ўваходжання беларускіх земляў у склад Расійскай імперыі царскі ўрад пачаў праводзіць тут пераўтвараючую палітыку. На тэрыторыі Беларусі былі ўтвораны агульнарасійскія адміністратыўныя органы і ўстановы. У пачатку XIX ст. стараабраднікі пражывалі ва ўсіх утвораных беларускіх губернях.

Калі першапачаткова абаронцы старога абраду сяліліся ў самых глухіх месцах, то з развіццём капіталістычных адносін яны селяцца, як правіла, у буйных мястэчках, прыгарадах і гарадах. У пачатку XIX ст. значнымі цэнтрамі стараабрадніцтва Магілёўскай губерні былі гарады Магілёў, Гомель, Беліца, Рагачоў, Орша, Сянно, Чаусы, Добруш, мястэчка Ветка. У Мінскай губерні гарады Бабруйск, Барысаў, Рэчыца, Мозыр. У канцы 20-х гадоў XIX ст. у гарадах назіраецца павелічэнне колькасці стараабраднікаў. Напрыклад, калі ў 1839 годзе ў г.Бабруйску іх пражывала 190 чалавек [12], то ў 1875 годзе – 600 [13].

Павелічэнне колькасці абаронцаў старога абраду ў гарадах тлумачыцца тым, што памешчыцкая эксплуатацыя вяла да закабалення і разарэння сялян і ўцёкаў іх у гарады, дзе яны сярод сваіх аднадумцаў знаходзілі прытулак і працу. Сярод стараабраднікаў г.Бабруйска ў 1839 годзе было 16 сямей мяшчан, якія займаліся рознымі промысламі, 6 купцоў. Купцамі другой гільдыі былі Ермолай Ильин Починин (сыновья Михаил, Иван, Филип, Кирило), Степан Ильин Починин (сыновья Василий, Еремей, Иосиф). Да купцоў трэцяй гільдыі адносіліся Кирило Наумов Курлянд, Карп Туронт, Наум Никитич Курляндчик, Федор Наумов Бобков [14] і іншыя.

Росту колькасці стараабраднікаў у беларускіх гарадах садзейнічаў таксама пераход з праваслаўя ў "раскол". Але пачынаючы з 1797 года такі пераход быў

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

забаронены, аб чым Міністэрства ўнутраных спраў паведаміла ўсім беларускім губернатарам [15]. Тым не менш, прыток у стараабрадніцтва з праваслаўя працягваўся. Такі пераход на беларускіх землях меў свае асаблівасці. Тут паралельна з праваслаўем існавала каталіцтва і ўніяцтва, а апошнія спачувалі стараабраднікам, бо ў праваслаўі бачылі свайго крыўдзіцеля. Яшчэ адной з прычын пераходу ў стараабрадніцтва, якую таксама неабходна ўлічваць, была эканамічная залежнасць. Даведзеныя да галечы гараджане, а галоўным чынам беглыя сяляне, шукалі падтрымкі ў багатых аднадумцаў, апошнія такім чынам атрымлівалі танную рабочую сілу, хавалі ўцекачоў, а таксама дапамагалі ім на першым часе матэрыяльна. Іменна ў такіх сітуацыях, як нідзе болей, праяўлялася пачуццё падтрымкі, аднадумства, прыхільнасці да сваёй рэлігіі. Адной з асаблівасцей "расколу" з'яўлялася існуючая ў ім арганізацыя ўзаемадапамогі ў спалучэнні з любоўю да працы, дзелавітасцю, майстэрствам, ашчаднасцю. Узаемадапамога падтрымлівала матэрыяльнае становішча стараабраднікаў. А калі ўлічыць, што многія абаронцы старога абраду на Магілёўшчыне не мелі глыбокіх каранёў, то такая ўзаемадапамога ім была неабходнай.

Далучэнне да Расійскай імперыі ўключыла Беларусь у агульнарасійскую гаспадарчую сістэму, змяніла напрамак эканамічнай дзейнасці многіх галін эканомікі ў стараабрадніцкіх раёнах пражывання. Прывяло гэта і да павелічэння памешчыцкай эксплуатацыі абаронцаў даўніны. Пачынаючы з 30-х гадоў XIX ст. супраць стараабраднікаў, пражываўшых на беларускіх землях, зрэшты, як і супраць іх у цэлым, пачынае праводзіцца палітыка ганенняў і праследаванняў. Імператарскім загадам ад 27 мая 1835 года абаронцы старога абраду, якія не маліліся за цара, былі аднесены да асабліва шкодных ерасей, а ў далейшым яны былі раздзелены на тры катэгорыі: самых шкодных – якія не прызнавалі шлюб і не маліліся за цара, шкодных – сюды адносіліся ўсе астатнія беспапоўцы, і менш шкодных – такімі лічыліся папоўцы [16]. У 1840 годзе ў Барысаўскім павеце пражывала 1878 абаронцаў старога абраду, што адносіліся да "менш шкодных", а ў Бабруйскім павеце – 1830 "шкодных" [17]. У Магілёўскай губерні ў 1847 годзе, па афіцыйных дадзеных паліцыі, "самых шкодных" абаронцаў даўніны не было. Большую частку складалі "менш шкодныя" – 14349 чалавек, з іх толькі ў Беліцкім павеце пражывала 12013 чалавек, і 329 стараабраднікаў у губерні адносілася да "шкодных", 318 з якіх пражывала ў Рагачоўскім павеце [18].

Ва ўсе часы існавання стараабрадніцтва стаяла пытанне аб іх колькасці. Да сённяшняга часу даследчыкі расколу рускай праваслаўнай царквы так і не прыйшлі да адной думкі аб метадалогіі падліку стараабраднікаў. Бурны рост колькасці абаронцаў даўніны палохаў урад і быў нявытлумачаны. Нізавое праваслаўнае духавенства, якое сачыла за стараабраднікамі, не называла сапраўдныя дадзеныя з-за боязі страціць работу або атрымаць пакаранне. Гэта прыводзіла да фальсіфікацыі дадзеных, на ўсіх узроўнях, пра рэальную колькасць стараабраднікаў. Самі ж яны, перасяляючыся з павета ў павет, або з губерні ў губерню, умела ўтойвалі вялікую колькасць сваіх аднадумцаў.

Усе даследчыкі гісторыі абаронцаў старога абраду сыходзіліся на думцы, што ў статыстыку расколу неабходна ўносіць папраўчы каэфіцыент. Калі Пецярбургскі статыстычны камітэт вывучаў гэтае пытанне, то прыйшоў да высновы, што афіцыйныя лічбы неабходна павялічыць у 10 разоў. Ліпрандзі, які займаўся пытаннямі расколу ў Міністэрстве ўнутраных спраў, лічыў, што статыстычныя дадзеныя па стараабрадніках заніжаныя ў 10-13 разоў [19]. Пазней даследчыкі таксама падтрымлівалі ідэю ўнясення папраўчага каэфіцыента. П.І. Мельнікаў зводзіў яго 1 : 5 або 1 : 8, а Н.М. Нікольскі – 1: 3-4 [20].

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Першая звестка аб перапісу стараабраднікаў на Магілёўшчыне ў першай палавіне XIX ст. знойдзена намі ў Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве ў С.-Пецярбурзе і адносіцца да 1811 года. У гэтым годзе, адносна рэвізскай казкі, у Бабруйскім старостве на землях памешчыкаў Ланскіх-Ваўкоў пражывала 398 стараабраднікаў, а ў 1815 годзе Камітэт Міністраў выключыў стараабраднікаў Бабруйскага староства з 7-мі рублёвага акладу, у якім яны як хлебаробы былі, і перавёў у 3-х рублёвы аклад, якім абкладаліся ўладальніцкія сяляне. Таксама Камітэт Міністраў пацвердзіў поўнае права стараабраднікаў (піліпонаў) карыстацца свабодаю і тымі выгадамі, якія былі адзначаны ў іх дамовах з памешчыкамі [21].

Пачатак афіцыйнага і штогадовага падліку стараабраднікаў у занава створаных губернях быў пакладзены імператарскім загадам ад 5 мая 1839 года. У ім адзначалася, што мясцовая паліцыя (гарадская, земская і сельская) абавязаны весці спісы аб нараджэнні і памёршых стараабрадніках, а пра іх агульную колькасць падаваць звесткі грамадзянскаму начальству [22]. Адзначым, што перыядычны іх падлік вёўся і раней. Звесткі збіраліся аб колькасці стараабрадніцкіх цэркваў, малельняў, скітоў, манастыроў, аб колькасці манахаў і манахінь. У складаемых ведамасцях адзначалася, да якога сагласу або толку абаронцы старога абраду належалі. У асобныя губерні пасылаліся спецыяльныя экспедыцыі для вывучэння "расколу" на месцах.

У 1839 годзе ў Бабруйскім павеце (Мінская губерня) пражывалі беспапоўцы агульнай колькасцю 1920 чалавек, у самім Бабруйску – 190 абаронцаў даўніны. Найбольш вядомымі стараабрадніцкімі населенымі пунктамі ў Бабруйскім павеце былі слабада Капусцінская і вёска Туркі [23]. У Магілёўскай губерні ў 1842 г. пражывала 13299 стараабраднікаў, у 1843 г. – 13961 і ў 1847 г. – 14678 абаронцаў старога абраду, з якіх 14349 адносіліся да папоўцаў і 329 да беспапоўцаў, што прызнавалі шлюб і маліліся за цара. У паветах колькасць стараабраднікаў папоўцаў была такой: Чэрыкаўскі павет – 157 чалавек, Капыскі – 251, Аршанскі – 80, Магілёўскі – 127 і ў самім Магілёве пражывала 11 беспапоўцаў [24].

Вялікую цікавасць для даследавання ўяўляюць сабой культавыя пабудовы стараабраднікаў. У архіўных дакументах, манаграфічнай і мастацкай літаратуры ўсіх перыядаў сустракаюцца іх розныя назвы: царква, малельня, капліца. Гады першай палавіны XIX ст. былі самымі "багатымі" у плане абмежавання правоў стараабраднікаў. Гэтае абмежаванне з'яўляецца і ў тлумачэнні разумення, што ёсць царква, малельня, капліца, а таксама разумення стараабраднік і "раскольнік". Забаранялася называць стараабрадніцкія храмы цэрквамі і ўжываць слова стараабраднік. Цэрквы папоўцаў было прапанавана называць у справаздачах капліцамі з прастоламі, а культавыя пабудовы беспапоўцаў – малельнямі.

Каб прынізіць ролю і ўплыў стараабрадніцтва, выдаецца шэраг загадаў і пастаноў Міністэрства ўнутраных спраў. У спробе спыніць будоўлю новых цэркваў і малітоўных дамоў 26 сакавіка 1822 года былі "Высочайше" зацверджаны правілы. Адносна іх забаранялася разглядаць пытанні па пабудаваных храмах і будаваць новыя. 15 верасня 1826 года Сенат выдаў загад на падставе правіл ад 26 сакавіка 1822 года, якім забаранялася будаваць што-небудзь падобнае на цэрквы, а існуючыя пакідаліся без змен [25]. 30 кастрычніка 1836 года Міністэрства ўнутраных спраў па сакрэтнай частцы разаслала ўсім губернатарам царскі загад, па якому забаранялася пераўтвараць сялянскія хаты ў публічныя малельні, а ў капліцах забаранялася

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ставіць прастолы як прыналежнасць праваслаўных цэркваў. Тыя прастолы, што былі ўстаноўлены да загаду, дазвалялася захаваць [26]. У 1839 годзе ў Зборы Законаў (арт. 48, т. XIV) было ўведзена наступнае палажэнне: а) "раскольніцкія" цэрквы, капліцы і малітоўныя дамы, пабудаваныя да 17 верасня 1826 года, пакідаюцца ў ранейшым стане; б) забараняецца не толькі будоўля падобных на цэрквы будынкаў, але і перабудова або ўзнаўленне старых пабудоў. Пабудаваныя культавыя будынкі без дазволу падлягалі закрыццю або знішчэнню [27].

У першай палавіне XIX ст. на беларускіх землях у стараабраднікаў яшчэ заставалася вялікая колькасць сваіх вядомых цэркваў, малітоўных дамоў і ўплывовых манастыроў. Паміж 1843 і 1847 гадамі ў Магілёўскай губерні налічвалася 28 капліц (18 з якіх мелі прастолы і па сутнасці былі цэрквамі), чатыры мужчынскія манастыры. У мястэчку Ветка і Спасавай слабадзе былі жаночыя манастыры. У Бабруйскім павеце (Мінская губерня) капліцы былі ў вёсцы Туркі і Капусцінай слабадзе [28].

Абаронцы старога абраду стварылі традыцыі і звычаі, якія яны захоўвалі і ўзбагачалі, перадаючы як святыню ў спадчыну сваім дзецям. Гэтыя традыцыі з'явіліся рэальнай асновай жыццядзейнасці стараабраднікаў, складаючы гарманічную сістэму абрадаў, жыццёвых правіл, звычаяў.

Распачатыя намаганні ўрада, а таксама маёмаснае расслаенне і з'яўленне больш багатых стараабраднікаў прывялі іх да адступлення ад многіх абрадавых правілаў. Федасееўцы, напрыклад, сталі паступова адмаўляцца ад правілаў абавязковага бясшлюбства. Згодніцкая палітыка прывяла да ўтварэння аднаверніцкай царквы [29], якая, як правіла, насаджалася сілай.

Змяненне спосабу жыцця, прызнанне пашпартоў, увядзенне абавязковай малітвы за цара, прызнанне шлюбаў і іншае сведчыць аб тым, што ўраду ўсё ж такі ўдалося дабіцца нейкіх зменаў. Усё пералічанае закранала і стараабраднікаў Магілёўшчыны. Другая палавіна XIX ст. рыхтавала ім складаныя выпрабаванні, бо апынуліся абаронцы старога абраду на Беларусі ў больш складаных умовах, чым іх аднадумцы на расійскіх землях.

## *ЛІТАРАТУРА*


1. ***Гарбацкі А.А.*** Стараабрадцы-папоўцы – гісторыя ўзнікнення // Веснік Брэсцкага універсітэта. – 1998. – № 3. – С. 81 – 82.
2. ***Гарбацкі А.А.*** Царкоўны раскол і стараверы на Беларусі ў другой палове XVII – першай палове XIX стст. // Беларускі гістарычны часопіс. – 1997. – № 4. – С. 61 – 63; ***Журавлев А.И.*** О древних стригольниках и новых раскольниках, так называемых старообрядцах, об их учении, делах и разногласиях // Полное историческое известие. – С.222.
3. Нацыянальны гістарычны архіў РБ. (далей НГА РБ). Ф.1297, воп.1, спр. 2045, арк. 3 адв.; ***Смирнов П.С.*** История русского раскола старообрядчества. – Рязань, 1893. – С. 129.
4. ***Гарбацкі А.А.*** Царкоўны раскол і стараверы ... – С. 63.
5. ***Дембовецкий А.С.*** Опыт описания Могилевской губерни... – Могилев, 1882. – С. 656; ***Мельников П.И.*** Очерки поповщины: Полн.собр.соч. – 1898. – Ч. 1. – С. 51.
6. ***Короткая Т.П., Прокошина Е.С.*** и др. Старообрядчество в Белоруссии. – Мн., 1992. – С. 33.
7. ***Макарий еп.*** История русского раскола известного под именем старообрядчества. – СПб., 1858. – С. 325; ***Смирнов П.С.*** История русского раскола... – С. 129.
8. ***Дембовецкий А.С.*** Опыт описания... – С. 656.
9. ***Гарбацкі А.А.*** Царкоўны раскол і стараверы... – С. 62.
10. Обзор Минской губерни за 1875 год. – Мн., 1876. – С. 93.


Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

11. Обзор Минской губерни за 1897 год. – Мн., 1898. – С. 580.
12. НГА РБ. Ф.295, воп.1, спр.701, арк.16.
13. Обзор Минской губерни за 1875 год. – Мн., 1876. – С. 93.
14. НГА РБ. Ф.295, воп.1, спр.701, арк.17адв. – 19адв.
15. Там жа. Ф.3219, воп.1, спр.31, арк.1 – 3.
16. Там жа. Ф.1297, воп.1, спр.6675, арк.39; ***Смирнов П.С.*** История русского раскола... – С. 220.
17. НГА РБ. Ф.295, воп.1, спр.701, арк.35 – 38, 40, 44 – 44 адв.
18. Там жа. Ф.1297, воп.1, спр.6675, арк.191.
19. ***Андреев В.В.*** Раскол и его значение в народной русской истории. – СПб., 1870. – С. 352; ***Кельсиев В.И.*** Сборник правительственных сведений о раскольниках. – 1861. – Вып.2. – С. 114.
20. ***Никольский Н.М.*** История русской церкви. – М., 1931. – С. 277.
21. Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў у С.-Пецярбурзе. (далей РДГА). Ф.1263, воп.1, спр.83, арк.556 – 558адв.
22. НГА РБ. Ф.1430, воп.1, спр.8095, арк.2; ф.1297, воп.1, спр.6675, арк.104 – 104адв.
23. Там жа. Ф.295, воп.1, спр.6675, арк.191.
24. Там жа. Ф.2001, воп.1, спр.170, арк.40 – 41; спр.197, арк.45; ф.1297, воп.1, спр.6675, арк.191.
25. РДГА. Ф.815, воп.16, спр.1045, арк.3адв. – 4.
26. НГА РБ. Ф.295, воп.1, спр.226, арк.109.
27. Там жа. Ф.1430, воп.1, спр.8143, арк.2 – 2адв.
28. Там жа. Ф.295, воп.1, спр.701, арк.56.
29. ***Горбацкий А.А.*** Единоверие и судьба русского этноса на Белоруссии // Чалавек. Этнас. Тэрыторыя. Праблемы развіцця заходняга рэгіёна Беларусі: Матэрыялы міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі. – Брэст, 1998. – С. 87 – 92.